НАВОШТА ПАТРЭБНЫ ПРАФСАЮЗ?
Гутарка са старшынёй прафкама Уладзімірам СУВОРАВЫМ пра новую Калектыўную дамову з БДУ
Стар. 2

СТУДГАРАДОК – ДУША БДУ
Агульнаму дому шматлікай арміі студэнтаў спаўняецца 45 гадоў. Успамінаем, як жылося ў інтэрнатах раней
Стар. 3–4

«КАРАНІ ФАРМІРУЮЦЬ НАС»
Імя прафесара Анатоля МІНЬКО нядаўна было занесена ў кнігу народнай славы Старадарожскага раёна
Стар. 6

«ВІВАТ СТУДЭНТ! ВІВАТ БДУ!»
Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт бадзёра сустрэў першакурснікаў
Стар. 8

Газета Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта

www.gazeta.bsu.by

УНІВЕРСІТЭТ

Пераможца V і XV Нацыянальных конкурсаў друкаваных СМІ «Залатая літара» ў намінацыях «Найлепшая шматтыражная газета», «Найлепшыя матэрыялы навуковай, навукова-папулярнай тэматыкі»

17 верасня 2019 года, № 11 (2217)

Рэктар БДУ Андрэй Кароль на адкрыцці форуму

Фота Васіля КУЗЬМІЧКІНА

Дырэктар РІКК БДУ Анатоль Тозік і намеснік генеральнага дырэктара Штаб-кватэры інстытутаў Канфуцыя Чжаа Гачэн

Еўрапейскі форум інстытутаў Канфуцыя

У БДУ 9–10 верасня прайшоў Еўрапейскі форум інстытутаў Канфуцыя. Важнай падзеяй стала ўрачыстае прысваенне Рэспубліканскаму інстытуту кітаязнаўства імя Канфуцыя БДУ высокага звання «Узорны інстытут Канфуцыя».

Цырымонія адкрыцця адбылася 9 верасня ў новым будынку РІКК БДУ ў Мінску на вул. Рэвалюцыйная, 11. Удзельнікамі маштабнага мерапрыемства сталі міністр адукацыі Беларусі **Ігар Карпенка,** Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол КНР у Беларусі **Цуй Цымін,** намеснік генеральнага дырэктара Штаб-кватэры інстытутаў Канфуцыя **Чжаа Гачэн** (КНР), рэктар БДУ **Андрэй Кароль,** кіраўнік дэлегацыі Далянскага політэхнічнага ўніверсітэта (ДПУ) **Нін Гуйлін,** кіраўнік прадстаўніцтва ў Сярэдняй Азіі і Балтыйскім рэгіёне «Чайна Мерчантс груп» **Ху Чжэн** і дырэктар РІКК БДУ **Анатоль Тозік.**

Усяго форум прыняў каля 50 кіраўнікоў і супрацоўнікаў інстытутаў Канфуцыя з Беларусі, Бельгіі, Босніі і Герцагавіны, Вялікабрытаніі, Германіі, Італіі, Нідэрландаў, Расіі, Румыніі, Славакіі, Францыі і Швецыі.

Кіраўнік Міністэрства адукацыі *Ігар Карпенка* назваў форум знакавым мерапрыемствам абвешчанага года адукацыі Беларусі ў Кітаі. Ён таксама адзначыў важную ролю інстытутаў Канфуцыя краіны ў развіцці беларуска-кітайскага супрацоўніцтва. Сёння ў краіне дзейнічаюць пяць інстытутаў, дзе вядзецца актыўная праца па папулярызацыі кітайскай мовы, забеспячэнні беларускай эканомікі і яе галін спецыялістамі-кітазнаўцамі. Кіраўнік ведамства выказаў упэўненасць, што абмеркаванне актуальных пытанняў дзейнасці інстытутаў Канфуцыя прывядзе да выпрацоўкі прагрэсіўных прапаноў, іх рэалізацыі і практычнага прымянення.

Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол КНР у Беларусі *Цуй Цымін* адзначыў развіццё супрацоўніцтва Беларусі і Кітая ў апошні час. «Актыўныя двухбаковыя кантакты ў галіне адукацыі ствараюць апору для развіцця гандлёва-эканамічных адносін і фарміруюць выдатную сацыяльную аснову для кітайска-беларускага сяброўства», – рэзюмаваў Цуй Цымін.

Пра шматгадовае супрацоўніцтва з кітайскімі адукацыйнымі ўстановамі распавёў рэктар БДУ *Андрэй Кароль*. Сёння партнёрамі вядучай ВНУ Беларусі з'яўляюцца 53 універсітэты КНР, з якімі рэалізуюцца адукацыйныя і навуковыя праграмы. Сярод іх рэктар вылучыў адкрыццё Сумеснага інстытуту на базе БДУ і ДПУ. Андрэй Кароль заявіў пра намер працягнуць пашырэнне супрацоўніцтва з Кітаем, якому актыўна спрыяе РІКК БДУ. Таксама кіраўнік ВНУ падкрэсліў важнасць форуму ў рэалізацыі стратэгічнай ініцыятывы «Адзін пояс і адзін шлях». Яна садзейнічае развіццю ўзаемавыгадных эканамічных адносін і стварэнню зусім новага тыпу міждзяржаўнага супрацоўніцтва. Па словах рэктара, акрамя эканамічнага складніка праекта, важную ролю ў яго рэалізацыі іграе ўзаемадзеянне ў галіне адукацыі і культуры.

Завяршыўся форум 10 верасня выніковым пасяджэннем у Кітайска-беларускім індустрыяльным парку «Вялікі камень».

Алена МАРЦУЛЕВІЧ

ВЕСТКІ З РЭКТАРАТА

ГЕНЕРАЛЬНЫ САКРАТАР Арганізацыі па бяспецы і супрацоўніцтве ў Еўропе (АБСЕ) **Томас Грэмінгер** наведаў БДУ.

Томас Грэмінгер сустрэўся з рэктарам БДУ Андрэем Каралём. Кіраўнік беларускай ВНУ падзякаваў высокаму госцю за яго згоду выступіць з лекцыяй перад студэнтамі і выкладчыкамі БДУ.

Даклад Томаса Грэмінгера быў прысвечаны тэме «Роля АБСЕ ў процідзеянні тэрарызму і вырашэнні канфліктаў».

У сваім выступленні спікер адзначыў, што тэрарызм з'яўляецца адной з найбольш сур'ёзных пагроз міру, бяспецы і стабільнасці, а таксама сацыяльна-эканамічнаму развіццю на прасторы АБСЕ і за яе межамі. Ён таксама падкрэсліў, што ўзначаленая ім арганізацыя прымае эфектыўныя захады па прадухіленні тэрарызму, і заклікаў кансалідаваць высілкі ў барацьбе з ім ва ўсіх яго формах і праявах.

Наведванне БДУ адбылося ў рамках візіту генеральнага сакратара Томаса Грэмінгера ў Беларусь з мэтай удзелу ў міжнароднай канферэнцыі «Барацьба з тэрарызмам пры дапамозе інавацыйных падыходаў і выкарыстання новых і ўзнікаючых тэхналогій», якая завяршылася ў Мінску 4 верасня.

НАЧАЛЬНІКАМ упраўлення па працы з персаналам прызначана **Вераніка Дабравольская.**

Дабравольская Вераніка Віктараўна нарадзілася ў 1969 годзе ў г. Мінск. У 1993 годзе скончыла гістарычны факультэт БДУ па спецыяльнасці «гісторыя», у 2001 – юрыдычны факультэт БДУ па спецыяльнасці «правазнаўства».

Працоўная дзейнасць у БДУ пачалася з 1986 года. З 1994 па 2009 год працавала на пасадах старшага інспектара аддзела кадраў, загадчыцы студэнцкага сектара ўпраўлення кадраў, начальнікам студэнцкага аддзела ўпраўлення кадраў БДУ. З 2009 па 2018 год – намеснік начальніка ўпраўлення кадраў. З 2018 па 2019 год – намеснік начальніка Галоўнага ўпраўлення адукацыйнай дзейнасці БДУ.

Паводле інфармацыі прэс-службы БДУ

УНІВЕРСІТЭТ
17 верасня 2019 года, № 11 (2217)

Навошта патрэбны прафсаюз?

Чарговы год працы Пярвічнай прафсаюзнай арганізацыі работнікаў БДУ завяршыўся значнай для ўніверсітэта падзеяй – абмеркавалі і прынялі новую Калектыўную дамову. Пра важныя змены ў дакуменце і іншыя вынікі працы распавёў старшыня прафкама Уладзімір Сувораў.



– Уладзімір Васільевіч, у чэрвені была падпісана Калектыўная дамова на 2019–2022 гады. Якія нованаўвядзенні ў ёй адлюстраваны?

– У Калектыўнай дамове наймальнік і прафсаюзная арганізацыя ад імя работнікаў БДУ бяруць на сябе абавязкі ў галіне працоўных і сацыяльна-эканамічных адносін, якія закліканы мінімізаваць сацыяльнае трэнне, стварыць умовы для ўстойлівага развіцця ўніверсітэта з улікам інтарэсаў большасці работнікаў. Галоўнае яе адрозненне ад папярэдняй КД – яна ўтрымлівае больш гарантый для работнікаў, асабліва датычна падаўжэння або заключэння кантрактаў. Звярну ўвагу, калі супрацоўніку засталося працаваць да выхаду на пенсію пяць гадоў і менш, пры гэтым ён добрасумленна працуе і не парушае працоўную дысцыпліну, то наймальнік абавязваецца заключаць або працягваць з ім (пры яго згодзе) кантракт на тэрмін не менш як да агульнаўстаноўленага пенсійнага ўзросту.

І кіраўніцтва БДУ, і прафкам імкнуцца прытрымлівацца дамоўленасцяў. Так, звальненне работніка пры скарачэнні штата ў абавязковым парадку павінна ўзгадняцца з прафкамам. За год у трох выпадках мы не далі згоды на звальненне, спаслаўшыся на нормы КД, і работнікі захавалі працоўныя месцы.

Яшчэ адна важная змена ў калектыўнай дамове, якую ініцыяваў прафкам, тычыцца матэрыяльнай дапамогі ў выпадку, калі супрацоўнік набыў пуцёўку на санаторна-курортнае лячэнне за поўны кошт. Як і раней, наймальнік і прафкам у роўных памерах часткова кампенсуюць выдаткаваныя супрацоўнікам сродкі. Аднак зараз на такую дапамогу могуць разлічваць толькі члены прафсаюза.

Рэкамендую старшыням прафбюро і кіраўнікам падраздзяленняў нефармальна азнаёміцца самім з КД, а таксама абмеркаваць яе ў працоўных калектывах.

– На Ваш погляд, наколькі прафкам спраўляецца са сваёй галоўнай задачай – забяспечваць сацыяльную падтрымку супрацоўнікаў БДУ?

– Калі параўноўваць з іншымі ВНУ, то наша Калектыўная дамова змяшчае больш за ўсё рознага роду сацыяльных гарантый. Адна з важных падзей, да якой непасрэдна датычная ППА, – у ліпені 51 сям'я работнікаў БДУ атрымала ключы ад новых кватэр. А ў 2017 годзе кватэры атрымалі 57 сем'яў.

Фота Васіля КУЗЬМІЧКІНА

Падпісанне Калектыўнай дамовы на 2019–2022 гг.

Новы шаснаццаціпавярховы дом знаходзіцца на вул. Міхалоўская Маскоўскага раёна. Усяго навасельцам з БДУ прапанавана 26 аднапакаёвых, 13 двухпакаёвых і 12 трохпакаёвых кватэр. На фота злева: супрацоўніца ўніверсітэта Наталля Ярашэвіч засяляецца ў новую кватэру

У дадзены момант КД 2019–2022 зарэгістраваны ва ўстаноўленым парадку і рыхтуецца да друку.

У электронным выглядзе яго можна знайсці па спасылцы www.bsu.by – сайты – унутраныя арганізацыі – прафсаюзны камітэт работнікаў БДУ ў раздзеле «Дакументы ПК».

Вядома, гэтаму папярэднічала цеснае супрацоўніцтва з гарадскімі ўладамі. Будзе 100-годдзе ўніверсітэта, і ў рамках гэтай падзеі мы плануем звярнуцца ў Мінгарвыканкам з просьбай разгледзець пытанне аб вылучэнні кватэр для супрацоўнікаў БДУ. Праблема ў тым, што, мяркуючы па інфармацыі СМІ, будаўніцтва жылых дамоў у Мінску абмяжоўваецца, а будаваць кватэру ў шматпавярховым доме ў Смалявічах, я думаю, ахвотных ва ўніверсітэце будзе няшмат.

На працягу года ППА работнікаў БДУ ўдзельнічала ў арганізацыі агульнаўніверсітэцкіх мерапрыемстваў, прысвечаных Дню заснавання БДУ, Міжнароднаму жаночаму дню 8 Сакавіка, Дню Перамогі. Сумесна з Саюзам жанчын БДУ быў праведзены круглы стол «Жанчыны ў прафсаюзным руху», у якім прынялі ўдзел прадстаўнікі ЦК галіновага прафсаюза. Набыццё білетаў на канцэрты і спектаклі, арганізацыя вольнага часу дзяцей супрацоўнікаў у навагоднія святы, экскурсіі – усё гэта традыцыйна было арганізавана прафкамам.

Добры рэзананс мела праведзеная спартакіяда работнікаў БДУ. Дарэчы, ППА работнікаў БДУ заваявала 1 месца ў аглядзе-конкурсе на найлепшую арганізацыю спартыўна-масавай работы сярод «пярвічак» галіновага прафсаюза. Наладжаны, нягледзячы на праблемы, якія ўзніклі ў сувязі са скарачэннем штату «Брыганціны», адпачынак дзяцей работнікаў, а таксама сямейны адпачынак у САК далі выдатную магчымасць сем'ям работнікаў правесці летні сезон.

Традыцыйна ў полі нашага зроку былі: грамадскі кантроль за выкананнем патрабаванняў аховы працы, фінансавая падтрымка работнікаў у цяжкай сітуацыі, акцыя «Прафсаюзы – дзецям», садзейнічанне ў вырашэнні жыллёвых пытанняў, аднаразовыя ўзнагароджанні актывістам і многае іншае. Уся праца ППА была накіравана на развіццё карпаратыўнага духу работнікаў, падтрыманне статусу ўніверсітэта як моцнай структуры, якая клапоціцца пра сваіх работнікаў.

– 1 верасня быў роўна год, як Вы з'яўляецеся старшынёй ППА работнікаў БДУ. Якую мэту Вы ставілі для сябе, займаючы пасаду, ці атрымалася яе дасягнуць?

– У якасці галоўнай мэты бачыў садзейнічанне карпаратыўным, чалавечым адносінам у калектыве БДУ. Мне здавалася важным накіраваць дзейнасць прафсаюзнай арганізацыі на развіццё ўніверсітэта менавіта як калектыву, члены якога ведаюць, разумеюць і прымаюць прынцыпы арганізацыі і сённяшнія задачы ўніверсітэта, актыўна ўдзельнічаюць у іх рэалізацыі. Многія сітуацыі пераканалі мяне, што менавіта праца ў гэтым кірунку можа забяспечыць рэальную абарону правоў і інтарэсаў работнікаў. І важную ролю тут павінны іграць прафсаюзныя лідары падраздзяленняў (старшыні прафбюро і прафгрупаргі), якім прафкам перадаў значныя паўнамоцтвы. Напрыклад, многія канфлікты пры падаўжэнні кантрактаў ПВС магла б папярэдзіць на ранняй стадыі працэдура выбараў. Бо менавіта яна заклікана вызначыць стаўленне супольнасці да чалавека. Нездарма старшыня прафбюро факультэта ўводзіцца ў склад савета факультэта: менавіта яго меркаванне, як легітымна абранага лідара, мае асаблівую вагу і ўспрымаецца як меркаванне большасці калектыву. А гэта ўжо адказнасць, як і пры візіраванні графікаў адпачынкаў, размеркавання нагрузкі, дакладных на прэміраванне. Заўважу, што, візіруючы іх, старшыня прафбюро гарантуе, што працоўны калектыў лічыць дакумент справядлівым у дадзенай сітуацыі і ў дадзены момант. Менавіта гэтая адказнасць прадугледжваецца, калі па ўзгадненні наймальніка і працоўнага калектыву выбарным прафсаюзным кіраўнікам і актыву прапануюць праз КД дадатковыя гарантыі занятасці.

Зараз у нашай прафсаюзнай арганізацыі налічваецца больш за 80 % работнікаў універсітэта. Кожны з членаў прафсаюза ў меру сваіх перакананняў і жаданняў ўдзельнічае ў фарміраванні, падтрыманні і развіцці калектыву нашай карпарацыі. Удзел кожнага рэалізуецца праз унёскі – 1 % ад заробку. Так мы дапамагаем нашым калегам аднавіцца пасля працяглай хваробы, прайсці лячэнне ў санаторыях, аздаравіцца летам у нашай «Брыганціне», дапамагаем у складаных і непрадбачаных сітуацыях, арганізоўваем прафесійныя святы і экскурсіі, віншуем нашых дзетак з Новым годам, займаемся ў групах здароўя і спабончаем у розных спартакіядах, спяваем у хоры работнікаў БДУ «Родніца» і многае іншае, што аб'ядноўвае калектыў.

У гэтым можна і не ўдзельнічаць. Можна, задаючы пытанне «а што мне даў прафсаюз?», заплюшчваць вочы і не бачыць, не адчуваць тую ролю, якую ўжо іграе прафсаюзная арганізацыя ў жыцці кожнага работніка, але трэба разумець, што каштоўнасць такога супрацоўніка для карпарацыі моцна памяншаецца.

У кожным падраздзяленні ёсць работнікі, якім хочацца даверыць, якія бачаць і ведаюць крыху больш. Звяртаюся да ўсіх членаў прафсаюза: выбірайце ў лідары менавіта такіх людзей, а не, як часам бывае, «па рэшткавым прынцыпе». Тады зразумелы сэнс набудуць словы: «Абарона працоўных і сацыяльна-эканамічных правоў і інтарэсаў работнікаў». Я заўважаю, што сітуацыя змяняецца ў лепшы бок: усё больш абраных прафсаюзных лідараў усведамляюць сваю ўзрастаючую ролю ў жыцці БДУ і імкнуцца ёй адпавядаць.

Валерыя БАНДАРЧЫК

Фота Васіля КУЗЬМІНКІНА

Жаночую баскетбольную каманду «БДУ-Цмокі» прэзентавалі 3 верасня. Гэта першая ў сістэме вышэйшай адукацыі краіны сумесная прафесійная каманда ВНУ і спартыўнага клуба.

Студэнцкі спорт: сярод дзяўчат БДУ з'явіліся «Цмокі»

У сваім звароце да каманды рэктар Андрэй Кароль падкрэсліў значнасць дадзенай падзеі для ўніверсітэта і айчыннай сістэмы вышэйшай адукацыі, бо супрацоўніцтва ВНУ з прафесійным клубам стане пачаткам сістэмнага развіцця студэнцкага спорту ў нашай краіне. Кіраўнік БДУ адзначыў агульнасць адукацыйнай і спартыўнай дзейнасці, дзе рэалізацыя кожнага чалавека магчымая толькі пры ўменні адчуваць партнёра, таго, хто знаходзіцца побач.

Каманда «БДУ-Цмокі» сфарміравалася з маладых гульцоў да 22 гадоў. Сярод іх: студэнтка 1 курса ФМА **Аліна Вярбіцкая** (выступала за гомельскі «СОЖ»), студэнтка 2 курса ФМА **Анастасія Сінельшчыкава** (удзельніца моладзевага чэмпіянату свету, які праходзіў у Мінску) і студэнтка 1 курса юрфака **Ірына Венская** (сёлета ўдзельнічала ў чэмпіянаце Еўропы У-18, заняла 9 месца ў дывізіёне А).

Міністр спорту і турызму Беларусі **Сяргей Кавальчук** выказаў спадзяванне, што стварэнне каманды дасць вялікі штуршок развіццю студэнцкага баскетбола ў краіне:

– Кіраўнік дзяржавы даў даручэнне актыўней развіваць студэнцкі спорт. Студэнцкі спорт – гэта наша будучыня, падрыхтоўка рэзерваў. Не варта адразу чакаць высокіх вынікаў, трэба набрацца цярпення.

Цяпер дзяўчаты актыўна трэніруюцца – дзевяць разоў у тыдзень – бо ўжо ў сезоне 2019/2020 ім трэба прадэманстраваць сваё прафесійнае майстэрства ў гульнях вышэйшай лігі чэмпіянату Беларусі, дзе выступаюць такія моцныя каманды, як «Цмокі-Мінск» і «Гарызонт».

– Наш праект разлічаны на два гады, каманда толькі стварылася. Дзяўчаткі маладыя, і спаборнічаць з камандамі, дзе ёсць дасведчаныя гульцы, па 3–4 легіянеркі, будзе складана, – адзначае галоўны трэнер «БДУ-Цмокі» **Алена Іваноўская** і падкрэслівае: – Пераход з юнацкага баскетбола ў дарослы – няпросты працэс, але мы заўсёды ставім падапечным высокія мэты, і ад матча да матча будзем рабіць высновы, працаваць над памылкамі і ўдасканальвацца.

Валерыя БАНДАРЧЫК

НАШЫ ЮБІЛЯРЫ

02 верасня Землякоў Леанід Яўгенавіч, прафесар кафедры паліталогіі

10 верасня Рабцаў Аляксандр Мікалаевіч, прафесар кафедры арганічнай хіміі

14 верасня Левакоў Анатоль Афанасьевіч, прафесар кафедры вышэйшай матэматыкі

15 верасня Храмцова Алена Аркадзьеўна, дацэнт кафедры генетыкі

17 верасня Мількамановіч Уладзімір Канстанцінавіч, дацэнт кафедры сацыяльнай работы і рэабіліталогіі

17 верасня Стэльмах Вячаслаў Фаміч, вядучы навуковы супрацоўнік НДЛ фізікі і тэхнікі паўправаднікоў

18 верасня Матузка Аляксандр Мікалаевіч, дацэнт кафедры рэгіянальнай геалогіі

20 верасня Кузняцоў Барыс Віктаравіч, дацэнт кафедры неарганічнай хіміі

26 верасня Яскевіч Ядзвіга Станіслававуна, прафесар кафедры сацыяльнай камунікацыі

29 верасня Смоліч Ігар Іванавіч, загадчык кафедры клетачнай біялогіі і біяінжынерыі раслін

АБ'ЯВЫ

БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ЎНІВЕРСІТЭТ

АБ'ЯЎЛЯЕ КОНКУРС НА ЗАМЯШЧЭННЕ ПАСАД:

ЗАГАДЧЫКА КАФЕДРЫ: заалогіі;

ПРАФЕСАРАЎ КАФЕДРАЎ: міжнароднага менеджменту, лічбавай эканомікі;

ДАЦЭНТАЎ КАФЕДРАЎ: філасофіі культуры, дыпламатычнай і консульскай службы, грамадзянскага права, экалагічнага і аграрнага права, інаватыкі і прадпрымальніцкай дзейнасці;

СТАРШЫХ ВЫКЛАДЧЫКАЎ КАФЕДРАЎ: канстытуцыйнага права, грамадзянскага права.

Тэрмін конкурсу – адзін месяц з дня апублікавання аб'явы.

Адрас: 220030, г. Мінск, вул. Бабруйская, 5а, упраўленне па рабоце з персаналам, тэл. 209 54 36.

ІНСТЫТУТ БІЗНЕСУ БДУ

АБ'ЯЎЛЯЕ КОНКУРС НА ЗАМЯШЧЭННЕ ПАСАД:

ДАЦЭНТАЎ КАФЕДРАЎ: маркетынгу, міжнароднага бізнесу;

СТАРШЫХ ВЫКЛАДЧЫКАЎ КАФЕДРАЎ: кіравання фінансамі і маёмасцю, кафедры міжнароднага бізнесу.

Тэрмін конкурсу – адзін месяц з дня апублікавання аб'явы.

Адрас: 220004, г. Мінск, вул. Шпалерная, 7, Дзяржаўная ўстанова адукацыі «Інстытут бізнесу Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта», тэл. 306 00 27, 306 00 28, www.sbmt.by, e-mail:sbmt@sbmt.by, mail@sbmt.by.

ІНСТЫТУТ ТЭАЛОГІІ ІМЯ СВЯТЫХ МЯФОДЗІЯ І КІРЫЛА БДУ

АБ'ЯЎЛЯЕ КОНКУРС НА ЗАМЯШЧЭННЕ ПАСАДЫ:

ВЫКЛАДЧЫКА КАФЕДРЫ біблеістыкі і хрысціянскага веравучэння.

Тэрмін конкурсу – адзін месяц з дня апублікавання аб'явы.

Адрас: 220030, г. Мінск, пр. Незалежнасці, 24, каб. 209. Тэл. 327 55 71.

МІЖНАРОДНЫ ДЗЯРЖАЎНЫ ЭКАЛАГІЧНЫ ІНСТЫТУТ ІМЯ А. Д. САХАРАВА БДУ

АБ'ЯЎЛЯЕ КОНКУРС НА ЗАМЯШЧЭННЕ ПАСАДЫ:

ЗАГАДЧЫКА КАФЕДРЫ дадатковай адукацыі.

Тэрмін падачы дакументаў – адзін месяц з дня апублікавання аб'явы.

Адрас: 220070, г. Мінск, вул. Даўгабродская, 23, корпус 1, каб. 202, тэл. 398 88 25, эл. пошта: info@iseu.by, ok@iseu.by.

БДУ Ў СМІ БЕЛАРУСІ

Этнолагі БДУ выявілі на Гродзеншчыне рарытэтнае Евангелле ўзростам каля 300 гадоў – БелТА, СТБ, sb.by, vb.by (01.08), «Мінск-Навіны», vgr.by, «Звязда», news.mail.ru (02.08), АНТ (03.08).

Студэнты БДУ перамаглі на конкурсе праектаў «PRO здароўе: біятэхналогіі для якасці жыцця» навуковага лагера «Таленавита» – sb.by (03.08), БТ-1 (05.08), «СБ. Беларусь сегодня» (06.08), vitvesti.by (09.08).

Сярэбранага медаля 31-й Міжнароднай алімпіяды школьнікаў па інфарматыцы ганараваны дзесяцікласнік Ліцэя БДУ Сяргей Процкі – zviazda.by (12.08), БелТА, sb.by, СТБ (13.08), «СБ. Беларусь сегодня», edu.gov.by, 1prof.by (14.08), «Настаўніцкая газета», «Знамя юности» (15.08).

Пра VII Міжнародны турнір юных даследчыкаў прыроды, які прайшоў у БДУ – БелТА, zviazda.by (15.08), АНТ, edu.gov.by (19.08), «Настаўніцкая газета» (20.08).

Пра засяленне студэнтаў БДУ ў інтэрнаты – БелТА, sb.by, «Мінск-Навіны» (26.08), БелТА (27.08), «СБ. Беларусь сегодня» (30.08).

Укараненне ў БДУ электронных заліковых кніжак – gp.by, «Мінск-Навіны», АНТ, news.21.by, kv.by, zviazda.by, aif.by, news.mail.ru (29.08), БТ–1, grodnonews.by, voran.by (02.09), lelchitsy.by (03.09), БелТА (05.09).

Жаночая баскетбольная каманда «БДУ-Цмокі» вышэйшай лігі адкрыла гульнявы сезон – zviazda.by, sb.by, БелТА, Мінск-Навіны, yandex.ru, edu.gov.by, vitebsk-region.gov.by, БТ–5, СТБ (03.09), «Рэспубліка», «Настаўніцкая газета» (05.09).

Пра Еўрапейскі форум інстытутаў Канфуцыя, адкрыццё новага будынка РІКК БДУ і прысваенне РІКК звання «Узорны інстытут Канфуцыя» – sb.by, БелТА, theworldnews.net (06.09), zviazda.by (08.09), БТ-1, Беларусь-24, interfax.by (09.09), news.rambler.ru, russian.news.cn, russian.china.org.cn (10.09).

Паводле інфармацыі прэс-службы БДУ

УНІВЕРСІТЭТ
17 верасня 2019 года, № 11 (2217)

Студэнцкі гарадок –

Студэнцкія гады можна параўнаць з цэлым жыццём. Ты прыходзіш у сцены ўніверсітэта яшчэ юны, нічога не ведаеш, з шырока расплюшчанымі вачыма, а потым, прайшоўшы праз гады вучобы, выпрабаванняў і новых знаёмстваў, выходзіш у жыццё ўжо паўнавартасным спецыялістам. І немалую ролю ў гэтым сталенні іграе інтэрнат, які становіцца для многіх студэнтаў другім домам. Сёлета нашаму студгарадку спаўняецца 45 гадоў.

Афіцыйна днём нараджэння студгарадка БДУ прынята лічыць 1974 год. Менавіта тады, 6 верасня, быў зацверджаны штатны расклад студэнцкага гарадка як самастойнага структурнага падраздзялення ўніверсітэта. Да гэтага моманту ў яго склад ужо ўвайшло 6 інтэрнатаў, у якіх утульна магло размясціцца каля 2 тысяч студэнтаў.

Але, як кожнае дзіця з часам расце і мацнее, так і наш студгарадок з моманту свайго стварэння стаў актыўна павялічвацца. У 1975 годзе былі ўведзены ў строй два інтэрнаты: № 2 на вул. Кастрычніцкай і № 3 на вул. Курчатава. У верасні 1985 года свае дзверы расчыніў інтэрнат № 8 на вул. Крапоткіна, які з 1998 года стаў домам для супрацоўнікаў нашага ўніверсітэта. І ў тым жа 1998 годзе сям'я нашага студэнцкага гарадка папоўнілася яшчэ інтэрнатам № 10 на вул. Курчатава, 8.

Але па-сапраўднаму сталае жыццё наш гарадок распачаў у 2008 годзе, калі адбылася закладка капсулы ў падмурак Студэнцкай вёскі Прэзідэнтам нашай краіны, а ўжо 19 студзеня 2010 года адкрыўся першы інтэрнат Студэнцкай вёскі, якім стаў студэнцкі інтэрнат БДУ № 11.

Апошнім у дружную сям'ю студгарадка БДУ 28 кастрычніка 2013 года ўвайшоў яшчэ адзін інтэрнат са Студэнцкай вёскі, на вул. Чурлёніса, 7 – № 4.

Такім чынам, сёння студэнцкі гарадок – гэта дом для больш як 8000 студэнтаў і 359 супрацоўнікаў БДУ і іх сем'яў. У яго ўваходзяць 9 студэнцкіх інтэрнатаў розных тыпаў планіроўкі (кватэрнага, блокавага і калідорнага), якія кожны год адчыняюць свае дзверы для тысяч хлопцаў і дзяўчат, а таксама адзін інтэрнат для работнікаў універсітэта.

Усе інтэрнаты студгарадка абсталяваны пакоямі самападрыхтоўкі, для актыўнага адпачынку і культурнай і забаўляльнай дзейнасці (пакой імянінніка, чытальная зала). З кожным годам матэрыяльна-тэхнічная база інтэрнатаў пашыраецца, што спрыяе больш камфортнаму пражыванню студэнтаў.

Штогод у летні перыяд у інтэрнатах праводзяцца розныя віды рамонтных прац, удзел у якіх прымаюць не толькі падрадныя арганізацыі, але і студэнцкія атрады па добраўпарадкаванні інтэрнатаў. Студэнты праводзяць унутраныя працы, якія дазваляюць захаваць ахайны знешні выгляд інтэрнатаў і годна сустрэць жыхароў у новым навучальным годзе.

Але студгарадок – гэта не толькі ўтульныя пакоі, якія не аднаму пакаленню выпускнікоў падарылі мноства добрых успамінаў, і нават не абсталяваныя прасторныя залы, дзе ў вольны ад вучобы час кожны можа або пайсці пачытаць кнігу ў чытальнай зале, або актыўна адпачыць на занятках аэробікай. Студэнцкі гарадок – гэта ў першую чаргу сям'я, згуртаваны калектыў аднадумцаў, якія вось ужо на працягу 45 гадоў падтрымлівае ў сценах інтэрнатаў душэўнае цяпло і вечнае свята, ствараючы і прымнажаючы традыцыі, дапамагаючы многім і многім дзецям знайсці і раскрыць у сабе таленты, утоеныя ў іх. Студэнцкі гарадок – гэта людзі, якія ствараюць усё для зручнага пражывання студэнтаў: загадчыкі, каменданты, выхавальнікі, педагогі-арганізатары, інструктары па фізічнай культуры, кастэляншы, дзяжурныя, прыбіральшчыцы, ліфцёры, інжынерная служба, дырэкцыя.

Пасля засялення дзеці трапляюць у свет сапраўднага студэнцкага жыцця. На базе інтэрнатаў праводзяцца розныя гурткі і секцыі, спартыўныя спаборніцтвы і маштабныя конкурсы студэнцкай творчасці. Тут кожны знойдзе сабе заняткі даспадобы. І не важна, ці ўмееш ты спяваць, танчыць або смачна гатаваць – студэнцкі гарадок дапаможа табе раскрыць свае таленты. Штогод студэнтам прапануецца паўдзельнічаць у такіх традыцыйных мерапрыемствах, як «Кулінарны конкурс», «Сярэбраныя струны», «Міс Вясна» ці «Супермен» і шматлікіх іншых.

Вялікай часткай працы студэнцкага гарадка з'яўляецца падтрымка студэнцкага самакіравання і рэалізацыя моладзевай палітыкі. Студгарадок – гэта сапраўдная кузня лідараў, што ўзгадавала нямала студэнтаў, якімі мы можам ганарыцца.

Штогод праводзяцца выбары ў студэнцкія саветы інтэрнатаў, дзе вы можаце выявіць сябе ў адным з пяці кірункаў працы: культурна-масавая, інфармацыйная, спартыўная, прававая ці жыллёва-побытавая.

Метадысты студэнцкага гарадка праводзяць навучанне, арганізуюць трэнінгі і выязныя семінары-практыкумы, якія дазваляюць кожнаму студэнту рэалізаваць свой патэнцыял і адчуць сябе часткай вялікай і дружнай сям'і. Бо галоўная каштоўнасць універсітэта – гэта студэнты. Без іх не існаваў бы і студгарадок. Галоўная задача і мэта любой арганізацыі – выгадаваць лідараў і даць дзецям пляцоўку для самаразвіцця, з якой яны змогуць скарыць новыя вяршыні.

У студэнцкага гарадка наперадзе яшчэ доўгае жыццё. Хочацца пажадаць яму прыбытку ў сям'і ў выглядзе новых інтэрнатаў і студэнтаў! І хай іх гарачыя вочы натхняюць вас на новыя праекты і ідэі!

Успаміны былых жыхароў інтэрнатаў БДУ:

Артур КАНДРАЦЕНКА, старшыня студэнцкай асамблеі (пражываў у інтэрнаце № 1):

«Тое, што яднае нас»

Студэнцтва – гэта незабыўны час, які запомніцца на ўсё жыццё. Адзін з яго этапаў – пражыванне ў студэнцкім інтэрнаце. Мне пашанцавала пражываць 5 гадоў у «капейцы», што знаходзіцца на вул. Свярдлова, 34. Новыя знаёмствы, пачатак кахання і сяброўства, першыя спробы прыгатавання ежы і спевы пад гітару на Свіслачы, ветлівыя ды натхняльныя супрацоўнікі інтэрната, студэнцкі савет і яго мерапрыемствы – гэта яднае нас. З цеплынёй узгадваецца праца са студгарадком, які на працягу пражывання дапамагаў нам і рабіў наша жыццё больш вясёлым, абдуманым і шчаслівым. Дзякуй вам!!!

Яўген ХАРУК, начальнік аддзела аналітыкі і прагназавання (пражываў у інтэрнатах № 8, № 11)

«Там я адчуваў падтрымку і ўвагу»

Студэнцкі гарадок для мяне з'яўляецца важным і прыкметным месцам у маім жыцці. На працягу пражывання ў інтэрнаце было шмат чаго: і радасць, і смутак, і перажыванні, і святы. Аднак самае галоўнае – гэта было са мной менавіта там, і менавіта там я адчуваў падтрымку і ўвагу. У інтэрнаце я сустрэў сваё каханне і сям'ю, сваіх сяброў, якія засталіся імі і да сёння. З днём нараджэння, дарагі студгарадок!

Дзмітрый МІКУЛКА, начальнік стартап-цэнтра БДУ (намеснік дырэктара Студэнцкага гарадка БДУ па выхаваўчай рабоце 2011–2018, пражываў у інтэрнатах № 2, № 3, № 8)

«Пакуль студэнты жывуць насычаным жыццём…»



Я дагэтуль перакананы, што інтэрнат – гэта найлепшая школа жыцця. Якраз там я вучыўся прымаць самастойныя рашэнні і несці за іх адказнасць – змагацца са спакусай не пайсці на пары, дзяліць невялікі пакой з некалькімі людзьмі і пры гэтым застацца сябрамі на ўсё жыццё, гатаваць з усяго, што засталося ў маразільніку, умець дажыць да канца месяца, калі стыпендыі няма ўжо праз тыдзень, здаваць сесіі, каб стыпендыя ўсё ж была, а потым адзначаць іх, не парушаючы правілаў пражывання, і зрабіць так, каб на наступны год ізноў засяліцца. Але толькі папрацаваўшы ў студгарадку, я зразумеў, праца якой вялікай колькасці людзей часта застаецца незаўважнай для студэнтаў. Пакуль яны жывуць насычаным студэнцкім жыццём, хтосьці робіць так, каб у кране была вада, гарэла святло, інтэрнат быў адрамантаваны і абсталяваны. Каб пры недахопе месцаў для 100-працэнтнага засялення чарга была выбудавана справядліва. Каб студэнты сталі не толькі прафесіяналамі, але і падрыхтаванымі да жыцця асобамі. І самае галоўнае – увесь гэты час хтосьці нясе адказнасць за жыццё і здароўе і шчыра перажывае, каб у іх усё было добра. Я лічу, што студгарадок стаў для мяне прафесійнай школай і даў магчымасць папрацаваць з выдатнымі людзьмі. З днём нараджэння, студгарадок!

Іван ЯНУШЭВІЧ, прарэктар па выхаваўчай рабоце і сацыяльных пытаннях (пражываў у інтэрнаце № 1)

«З усяго нашага курса ў інтэрнаце ўтварылася 7 сем'яў»

Я жыў у інтэрнаце № 1 на вуліцы Свярдлова, 34, з 1991 па 1997 год, 5 гадоў як студэнт і адзін год як выхавальнік і начны камендант. Таму мой другі запіс у працоўнай кніжцы – «выхавальнік інтэрната № 1 Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта». Пражываючы ў інтэрнаце, я быў старастам 4 паверха і намеснікам старшыні студэнцкага савета. Праз год інтэрнат быў пастаўлены на капітальны рамонт, і працаваць там я перастаў. Спачатку жыло нас 5 чалавек у пакоі, затым пераехаў у «двушку», дзе жыў з братам. А потым я жаніўся і жыў ужо з жонкай. Жонка, дарэчы, таксама пражывала ў інтэрнаце, вучылася тады на гістарычным факультэце. Наша сямейнае жыццё пачалося ў інтэрнаце студэнцкага гарадка, тым часам з'явіўся і сын. Ды і наогул, з усяго нашага курса ў інтэрнаце ўтварылася 7 сем'яў, і наша адна з іх. Пажадаць студгарадку хацелася б, вядома, шмат новых інтэрнатаў, каб засяліцца змаглі ўсе ахвотнікі,

СТУДЕНТЫ РАБФАКА БГУ В ОБЩЕЖИТИИ. 1927 г.



БЕЛОРУССКИЙ ГОСУДАРСТВЕННЫЙ УНИВЕРСИТЕТ ИМЕНИ В.И.ЛЕНИНА

УТВЕРЖДАЮ:
Ректор
Профессор /Е.СИНОРСКИЙ/
"6" сентября 1974 г.

ИЗМЕНЕНИЕ ШТАТНОГО РАСПИСАНИЯ

аппарата управления Белгосуниверситета на 1974 год

Наименование должностей	К-во единиц	Должностной оклад в месяц	Месячный фонд зарплаты	Примечания
Ввести в аппарат управления штатные должности студенческого городка:				
1. Директор студенческого городка	I	I50	I50	
2. Зам. директора по политико-воспитательной работе	I	I20	I20	
3. Начальник службы эксплуатации зданий /он же зам.директора/	I	I50	I50	
4. Старший бухгалтер	I	95	95	
5. Инженер	I	I00	I00	
6. Старший инспектор по заселению	I	90	90	
7. Заведующий складом	I	85	85	
8. Инструктор по противопожарной безопасности	I	70	70	
Итого	8		860	

Указанное изменение ввести в действие с I сентября 1974 года.

Начальник планово-финансового отдела /А.ТЕРЕХОВ/
Главный бухгалтер /Г.СВОБОДОВСКИЙ/

душа БДУ

Зварот да першакурснікаў БДУ ад дырэктара студэнцкага гарадка Алы Мелех:

Дарагі першакурснік!

Рады вітаць цябе ў вялікай і дружнай сям'і Студэнцкага гарадка БДУ! Сваімі ведамі і ўпартасцю ты даказаў, што варты насіць ганаровае званне студэнта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. Зараз менавіта ты сваімі ўчынкамі і дасягненнямі зможаш пакінуць след у гісторыі ўніверсітэта!

Табе пашчасціла паступіць у юбілейны для студгарадка год! 45-годдзе для нас – гэта значная дата, бо ўвесь час мы ствараем студэнцкі свет для кожнага, хто тут пражывае. А, як кажа даўно ўсім вядомая мудрасць, хто не жыў у інтэрнаце, той не быў студэнтам.

Мы спадзяёмся, што студэнцкае жыццё падорыць табе шмат новых уражанняў, сцены інтэрната будуць другім домам, твае суседзі стануць добрымі сябрамі, а студгарадок – тваім улюбёным горадам – горадам твайго паспяховага студэнцтва.

Будзь смелым, імкніся рэалізаваць сябе і атрымаць неабходны жыццёвы досвед, а мы з радасцю табе ў гэтым дапаможам!

і абавязкова захаваць тую атмасферу, якая заўсёды панавала ў студэнцкім гарадку.

Віктар ШАДУРСКІ,
дэкан ФМА (пражываў у інтэрнатах № 1, № 2, № 3 і № 8)

«Мне часам сніцца, што мяне зноў засялілі ў інтэрнат!»

На працягу сваёй працяглай вучобы ў БДУ я меў задавальненне жыць у чатырох інтэрнатах. Месца атрымаў толькі на другім курсе, на першым месцаў вылучалася вельмі мала, бо гэта быў год маскоўскай Алімпіяды–1980. У інтэрнаце № 8 я атрымаў асобны пакой, калі быў аспірантам. Мы сталі першымі жыхарамі новага і нестандартнага будынка.

З універсітэцкімі сябрамі дагэтуль падтрымліваю сувязь. Прайшло ўжо сорак гадоў ад нашага паступлення ў БДУ, немалы час, як і для студэнцкага гарадка! Сёлета сустракаліся з аднакурснікамі і наведалі родны інтэрнат № 1 на вуліцы Свярдлова. Студгарадок дапамог нам арганізаваць сустрэчу, нам правялі экскурсію па інтэрнаце, у якім мы ўсе жылі і з якім так шмат звязана. Было вельмі цікава паглядзець, як многае змянілася. У наш час ён быў каліднорнага тыпу, а зараз ператварыўся ў блокавы.

Наш перыяд навучання характарызаваўся развітым студэнцкім самакіраваннем. Акрамя таго, ва ўніверсітэце вучылася шмат хлопцаў з войска, яны займалі лідарскія пазіцыі ў саветах інтэрната і дадавалі ў студэнцкі побыт некаторыя элементы армейскай дысцыпліны. Напрыклад, маладых студэнтаў вучылі акуратна засцілаць ложкі. У той час, як, зрэшты, і цяпер, у інтэрнатах жыло шмат замежных студэнтаў, таму ў нас былі вельмі развітыя інтэрнацыянальныя структуры. Гэтаму надавала вялікую ўвагу кіраўніцтва ўніверсітэта. Самі замежныя студэнты былі вельмі актыўнымі, дапамагалі нам праводзіць мерапрыемствы. У інтэрнаце № 1 дзейнічаў шырока вядомы ў наш час клуб інтэрнацыянальнага сяброўства, сустаршынёй якога з'яўляўся я! Другім сустаршынёй быў студэнт з Германскай Дэмакратычнай Рэспублікі *Штэфан Мелех*! Праводзілася вельмі шмат мерапрыемстваў, вечароў, сустрэч, прычым іх арганізоўвалі самі студэнты. Пасад выхавальнікаў тады не было, а камендант вырашала толькі гаспадарчыя пытанні. Вядома, больш за ўсё студэнты любілі дыскатэкі. Іх з нецярпеннем чакалі! У першым інтэрнаце іх праводзілі ў холе, а ў другім – у чытальных пакоях на верхніх паверхах. Студэнты розных пакаленняў падобныя, яны хочуць знаёміцца, камунікаваць. А дзе гэта лепш зрабіць, калі не на дыскатэцы. Тады былі асабліва папулярныя група «Машына часу», італьянская эстрада, англамоўныя групы, напрыклад, BeeGees. Музыку для дыскатэкі студэнты самі запісвалі на магнітафоны.

Нягледзячы на тое, што прайшло шмат гадоў, мне часам сніцца, што мяне зноў засялілі ў інтэрнат!

Хочацца пажадаць студэнцкаму гарадку, каб жыццё ў ім заставалася такім жа вясёлым! Каб правілы не абмяжоўвалі творчасць і ініцыятыву студэнтаў, але пры гэтым было як мага менш правапарушэнняў! Бо само слова «общежитие» азначае, што гэта месца «агульнага жыцця»! Менавіта тут трэба фарміраваць культуру сумеснага пражывання, імкнуцца падтрымліваць добрыя адносіны з суседзямі, вучыцца кампрамісам!

Міхаіл ЧАРАПЕННІКАЎ,
прарэктар па эканоміцы і матэрыяльна-тэхнічным развіцці (дырэктар Студэнцкага гарадка БДУ ў 2005–2015 г., пражываў у інтэрнатах № 1, № 8)

«Неяк мы 3 тыдні жылі наогул без святла…»

За гады навучання ў БДУ мне пашчасціла пажыць у 2 інтэрнатах студэнцкага гарадка. Пачынаючы з 25 жніўня 1995 года, 6 гадоў я пражыў у інтэрнаце № 2. Гэта былі апошнія гады перад капітальным рамонтам. А ўжо аспірантам паўгода жыў у інтэрнаце № 8.

Цяпер у мяне самога сын першакурснік, і я, з аднаго боку, яму шчыра зайздрошчу, бо ў яго пачаліся самыя цудоўныя гады, а з іншага боку, мне яго трохі шкада, бо ён жыве з мамай, татам, сястрой і братам у Мінску і не атрымае таго дадатковага бонуса жыцця ў інтэрнаце, не адчуе таго, што, на мой погляд, павінен адчуць.

У жыцці ў інтэрнаце ёсць свой шарм, гэта класна, выдатна, цудоўна. Сёлета спаўняецца 20 гадоў з моманту нашага выпуску з універсітэта, і тэма, якую мы абмяркоўваем пры сустрэчах з сябрамі – як нам добра і весела жылося ў інтэрнаце. З усімі, з кім жыў у інтэрнаце, я дагэтуль падтрымліваю цёплыя сяброўскія адносіны. З многімі мы цяпер разам працуем ва ўніверсітэце. Напрыклад, *Аляксей Багамазаў* быў два гады маім суседам па блоку. Для мяне паняцце «аднакурснікі» шырэйшае, чым звычайна прынята лічыць. Гэта не абавязкова тыя, хто вучыўся са мной у адной групе, на адным курсе ці факультэце, гэта тыя, хто жыў са мной у інтэрнаце.

Насамрэч, было мноства розных цікавых гісторый падчас пражывання ў інтэрнаце. Першая, што прыйшла мне ў галаву, адбылася ў 1998 годзе. У гэты год я жаніўся і прывёз з Віцебска ў інтэрнат сваю жонку. А 13 верасня ў ім адбыўся пажар, згарэла праводка. Кіраўніцтву ўніверсітэта атрымалася пераканаць пажарную службу горада ў тым, што студэнтаў нікуды высяляць нельга. І мы 3 тыдні жылі наогул без святла! Халадзільніка, натуральна, таксама не было, пашчасціла яшчэ, што пліта газавая. Прадукты куплялі толькі на адзін дзень, каб нічога не заставалася. Добра памятаю сябе ў краме, дзе я бяру 4 сасіскі і 30 грамаў масла толькі з той прычыны, што 30 грамаў масла я зараз закіну ў бульбачку і з'ем. Прадаўшчыца ўзважвае мне 35 ці 36 і, гледзячы на мяне, беднага студэнта, цікавіцца: «Нічога, што шмат?» Я не стаў тлумачыць, што насамрэч мой бюджэт дазваляе мне купіць больш, але ў гэтым няма неабходнасці. Вось такі пацешны форс-мажор. Інтэрнат – месца, дзе праходзіш праз ваду, агонь і медныя трубы.

Студэнцкі гарадок для мяне – гэта малая радзіма. Тут пачаўся мой шлях студэнцкага лідара, рэалізоўваліся першыя праекты. Мы са студэнцкім гарадком амаль аднагодкі. Студгарадок крыху старэйшы, але гэта для мяне вельмі сімвалічна. Калі табе ўжо за 40, ты не заўсёды такі актыўны, як у 20, таму студэнцкаму гарадку я пажадаю заставацца вечна маладым, жвавым, вясёлым, рухавым, ініцыятыўным, тады будуць праекты, будзе іх рэалізацыя... З днём нараджэння, любімы студгарадок!

Аляксандр КАДЛУБАЙ,
намеснік міністра адукацыі Беларусі (пражываў у інтэрнатах № 1, № 2, № 3)

«Ну што, да „Гаю“ без прыпынкаў?»

За гады майго студэнцтва я паспеў пажыць у трох інтэрнатах студгарадка БДУ: гэта «тройка«, «двойка» і «капейка». Мы былі першымі жыхарамі інтэрната № 1, якім далі месцы адразу пасля рамонту. Там і пражыў з 3 па 5 курс, а апошнія паўгода яшчэ і працаваў вячэрнім камендантам. Акрамя таго, з першага курса і да пятага я ўваходзіў у склад аператыўнага атрада.

У «тройцы» я пазнаёміўся са сваёй жонкай. Мы жылі на адным паверсе ў пакоях насупраць. Пасля трэцяга курса распісаліся і ўжо жылі разам. Вось такая ў нас класічная студэнцкая сям'я. На ўласным прыкладзе я бачу, што сямейныя пары, якія сфарміраваліся ў студэнцкія гады, больш стабільныя і моцныя, бо людзі ведаюць адзін аднаго з юнацтва, разам сталеюць, разам вучацца ўладкоўваць свой побыт.

Пра жыццё ў інтэрнатах захаваліся толькі цёплыя ўспаміны. Шмат вучыліся, арганізоўвалі мерапрыемствы, у тым ліку і сумесныя з факультэтамі, займаліся спортам, праводзілі дыскатэкі. Я вельмі рады таму, што пажыў у розных інтэрнатах, гэта дало мне магчымасць пагутарыць са студэнтамі з розных факультэтаў, многіх дагэтуль добра памятаю. З універсітэцкімі сябрамі мы падтрымліваем сувязь. На шчасце, у наш час гэта не праблема, лісты пісаць і маркі ляпіць ужо не трэба. У гэтым годзе было 15 гадоў з моманту выпуску. Прыемна зараз сустракаць старых знаёмых, сваіх студэнцкіх сяброў. Многія зараз займаюць кіраўнічыя пасады, многія выкладаюць ва ўніверсітэце.

Было шмат смешных і цікавых момантаў – гэта ж студэнцкае жыццё, яно па азначэнні павінна быць насычаным пацешнымі гісторыямі. Заўсёды ўспамінаю 47 аўтобус! На плошчы Незалежнасці ён запаўняўся студэнтамі, кіроўца зачыняў дзверы і казаў: «Ну што, да „Гаю“ без прыпынкаў?» Студэнты ў адзін голас весела крычалі: «Так!» І аўтобус, не спыняючыся, ехаў да канцавога. Цяпер прыгадваю і шчыра шкадую тых пасажыраў, якія апынуліся ў аўтобусе і не змаглі выйсці на плошчы Казінца, бо ехалі з усімі да апошняга прыпынку.

Жадаю студгарадку БДУ магчымасці забяспечыць усіх сваіх студэнтаў месцамі ў інтэрнатах. Абавязкова захаваць студэнцкі дух і крэатыў. І хай ні студэнтаў, ні работнікаў не пакідае ўсведамленне таго, што яны жывуць і працуюць у такім выдатным месцы.

Я вельмі ўдзячны лёсу за тое, што вучыўся менавіта ў БДУ і жыў у інтэрнатах нашага слаўнага студэнцкага гарадка.

Падрыхтавала
Наталля БАРАВІК

УНІВЕРСІТЭТ
17 верасня 2019 года, № 11 (2217)

Анатоль Мінько:

«Карані фарміруюць нас…»

Імя **Анатоля МІНЬКО,** загадчыка кафедры фізічнай оптыкі і прыкладной інфарматыкі фізічнага факультэта БДУ, нядаўна было занесена ў кнігу народнай славы Старадарожскага раёна Мінскай вобласці. Мы пагаварылі з прафесарам пра малую радзіму, навуку і маладое пакаленне.

Анатоль Мінько і Валянціна Жукавец з вучнямі школы № 2

«Малая радзіма – гэта ў першую чаргу старадарожская зямля маіх продкаў»

Малая радзіма для ўсіх становіцца падмуркам, на якім узводзіцца будучыня. Карані фарміруюць нас, даюць жыццёва неабходны багаж ведаў. Як распавядае Анатоль Антонавіч, і прадзеды, і дзед Васіль, і тата Антон Васільевіч жылі ў маляўнічым кутку Старадарожчыны, вёсцы Горкі, якая размясцілася на рацэ Арэса.

«Праўда, я нарадзіўся ў г. Омск-Кіраўск (Расія), дзе пасля Вялікай Айчыннай вайны праходзіў службу мой бацька, – расказвае наш герой. – Ён у 1940 г., пасля заканчэння з адзнакай Горацкай школы, паступіў на вучобу ў Ленінградскае ваеннае вучылішча інжынерных войскаў і з першых месяцаў вайны прайшоў цяжкі вайсковы шлях ад адступлення Чырвонай Арміі да ўзяцця Кёнігсберга. У Старых Дарогах жыла і мая бабуля Надзея па матчынай лініі. Сюды наша сям'я вярнулася ў 1957 годзе. Малая радзіма – гэта мае родныя, блізкія людзі і сябры, на жаль, многіх з іх ужо няма ў жывых, але жыве светлая памяць пра іх».

Ён успамінае, што з малых гадоў з татам і братам Сашам праводзіў летнія вакацыі ў лесе ці на рэках Старадарожчыны. Збор ягад, грыбоў, лоўля рыбы для іх былі не толькі захапленнем, але і магчымасцю зарабіць грошай. Для сябе і для здачы нарыхтоўшчыку збіралі чарніцы, буякі, суніцы. З усмешкай гаворыць пра тое, што дагэтуль можа спаборнічаць у зборы ягад з любой жанчынай. А калі прыязджае на малую радзіму, то абавязкова зазірне ў лес. «Для нашага кутка Мінскай вобласці характэрны магутныя лясы, багатыя на грыбы і ягады», – падкрэслівае суразмоўца.

На малой радзіме фарміруецца характар, лічыць наш герой. Змагацца за справядлівасць – гэтае важнае ўменне ў ім выхавалі аповеды бацькі, які прайшоў ВАВ. А дабрыню да людзей, увагу да сяброў і падначаленых яму прывіла мама Надзея Уладзіміраўна, якая працавала ў СШ № 2 Старых Дарог медсястрой і вяла вытворчыя заняткі кройкі і шыцця адзення.

«Цікавасць да матэматыкі і фізікі ў мяне з'явілася ў 6-7 класах»

«Тады абмяркоўвалі з татам задачы павышанай складанасці, – успамінае Анатоль Антонавіч. – Вырашаць асабліва складаныя задачы мог да позняга вечара, бо дзень займалі ўрокі, праца па хатняй гаспадарцы, часцяком футбол і шахматы. Я і дагэтуль захапляюся няпростымі задачамі, як па матэматыцы, так і па фізіцы. Гэта развівае логіку і дае зарад да навукова-пошукавых дзеянняў».

Любоў да навукі перадаецца ў сям'і Мінько ад пакалення да пакалення. Так, унук і ўнучкі таксама любяць вырашаць з дзядулем Толем розныя задачы і галаваломкі. Ён з гонарам распавядае пра тое, што ўнучка Яна (24 гады) атрымала два дыпломы аб вышэйшай адукацыі і паспяхова працуе менеджарам у сферы міжнародных адносін, Карына (12 гадоў) на завочнай міжнароднай алімпіядзе па матэматыцы летась заняла 2-е месца, а Улада (11 гадоў) спрытна вырашае задачы павышанай складанасці і ўдзельнічае ў алімпіядах, а яшчэ ўнук Пеця (7 гадоў) любіць вырашаць складаныя задачы па арыфметыцы і логіцы. Ёсць у навукоўца каронныя задачы для студэнтаў і калегаў па факультэце.

«Калі цікавасць да матэматыкі і фізікі ўва мне абудзілі бацька і таленавітыя настаўнікі школы, то выбар аптычнага кірунку ў маёй дзейнасці вызначылі яркія навукоўцы БДУ, – тлумачыць прафесар Мінько. – А менавіта акадэмік А. Н. Сеўчанка – былы рэктар БДУ, заг. каф. фізічнай оптыкі; акадэмік Л. В. Валадзько – былы прарэктар БДУ па навуковай рабоце, заг. каф. спектральнага аналізу (мой кіраўнік кандыдацкай дысертацыі). Станоўчым прыкладам для мяне быў і стрыечны брат Л. Я. Мінько, які таксама родам са Старадарожскага раёна, д. ф.-м. н., лаўрэат дзяржаўных прэмій БССР і РБ. Паўплывалі і іншыя адораныя вучні аптычнай школы, пра якіх я распавядаў у кнізе „Фізічная оптыка ў БДУ" (2013 г.)».

«На працягу ўсяго жыцця не губляю сувязі з роднай сярэдняй школай № 2»

Родную Старадарожскую СШ № 2 ён скончыў з сярэбраным медалём у 1966 годзе. Пра сваіх настаўнікаў ён кажа так: «Настаўніца матэматыкі Н. П. Лебедзева давала мне кантрольныя працы індывідуальна – заданні павышанай складанасці. Настаўнік фізікі І. Т. Дранковіч часта выклікаў да дошкі, каб я вырашаў задачы і распавядаў астатнім дзецям асноўныя законы фізікі, рыхтаваў мяне да алімпіяд, а яшчэ пазней настаўнік фізікі А. В. Гарон падкідаў мне няпростыя задачы на кемлівасць і пабудову розных радыётэхнічных прылад. Я дагэтуль з цяплом і ўдзячнасцю іх узгадваю».

Па словах загадчыка кафедры, вось ужо больш за 40 гадоў школьны настаўнік фізікі Валянціна Шуліноўская актыўна супрацоўнічае з фізічным факультэтам БДУ. Рыхтуе вучняў да алімпіяд па фізіцы, да турніраў юных фізікаў, навукова-практычных канферэнцый. Вучні пад кіраўніцтвам дасведчанага педагога штогод займаюць прызавыя месцы на навуковых спаборніцтвах.

Выпускнікі школы № 2 і гімназіі № 1 атрымліваюць вышэйшую адукацыю ў БДУ (і не толькі на фізічным факультэце). «Прыкладаў можна прывесці шмат, сярод іх ёсць ужо і кандыдаты навук, і кіраўнікі арганізацый. У прыватнасці, адзначу Уладзіміра Прановіча, які скончыў СШ № 2, паступіў на фізічны факультэт БДУ, 25 гадоў працаваў у НДІ ПФП імя А. Н. Сеўчанкі БДУ, абараніў кандыдацкую дысертацыю. У наш час займаецца распрацоўкай сучасных бінокляў і прыцэлаў на фірме „Юкон"», – дзеліцца навуковец.

Сустрэчы выкладчыкаў і студэнтаў БДУ з вучнямі Старадарожскага раёна

Для Анатоля Антонавіча малая радзіма – гэта добрыя, спагадлівыя землякі. Ён часты госць на старадарожскай зямлі. На працягу ўсёй сваёй працоўнай дзейнасці ўдзельнічаў у мерапрыемствах, якія праводзіліся мясцовым райвыканкамам, наладжваў творчыя сувязі са школамі, з вытворчымі калектывамі і арганізацыямі – у прыватнасці, з ААТ «Старадарожскі механічны завод», дзе галоўным інжынерам працаваў яго брат Аляксандр. Пра сваіх землякоў ён гаворыць так:

«Хачу адзначыць увагу да адукацыі ў раёне з боку старшыні райвыканкама М. М. Карповіча, старшыні раённага савета дэпутатаў Д. М. Давыдава. Таксама гэта начальнік упраўлення адукацыі, спорту і турызму райвыканкама В. Р. Жукавец, якая на працягу 2014–2018 гг. была дырэктарам СШ № 2 і супрацоўнічала з фізфакам БДУ. Тады сумесна з дэканатам фізічнага факультэта мы неаднаразова арганізоўвалі сустрэчы выкладчыкаў і студэнтаў з вучнямі старэйшых класаў школ Старадарожскага раёна».

Падчас такіх сустрэч выкладчыкі распавядалі пра факультэт, навуковую дзейнасць, міжнародныя сувязі, выпускнікоў, працаўладкаванне, пра правілы прыёму і льготы. Студэнты дэманстравалі фізічныя доследы, распавядалі пра магчымасці для максімальнага раскрыцця талентаў у вучобе, спорце, творчасці, якія даюцца ў ВНУ. Нават тыя школьнікі, хто раней не вельмі сябраваў з фізікай, абяцалі прыкласці больш высілкаў для яе вывучэння ў наступным навучальным годзе.

Анатоль Антонавіч тлумачыць, што такія мерапрыемствы накіраваны на прафарыентацыю школьнікаў і даюць станоўчы эфект – школьнікі Старадарожчыны паступаюць у БДУ. І дадае: «Заўсёды рады магчымасці пабываць у роднай школе. Хочацца перадаць досвед, патрыятызм моладзі. Я распавядаю не толькі пра факультэт, але і пра тое, як трэба ставіцца да старэйшага пакалення, як паводзіць сябе ў складаных сітуацыях. Пасля такой сустрэчы ў школе выпадкова на калідоры пачуў гутарку вучняў малодшых класаў, яны паміж сабой гаварылі: «Слухай, фізіка – гэта так цікава! Давай мы цяпер будзем больш вучыцца і пойдзем потым на фізфак!»

Бачу вялікую зацікаўленасць і ў студэнтаў, якія ездзяць са мной у школу. Яны паказваюць тыя доследы, якія не выкладаюць на ўроках. У нас падрыхтаваныя эксперыментальныя мабільныя ўстаноўкі, заказваем аўтобус ва ўніверсітэце і практыкуем выезды ў розныя раёны краіны. Я заўважыў, што маладыя людзі цікавяцца навукай, ім трэба толькі паказаць, растлумачыць, натхніць».

Адметна, на 50-гадовым юбілеі СШ № 2 у 2013 годзе загадчык кафедры А. А. Мінько ад імя міністра ўручаў школе Ганаровую грамату Міністэрства адукацыі і паабяцаў дапамагчы ў арганізацыі кабінета фізікі. Абяцанне выканана, пасля чаго ў школе ажыццявілі рамонт. «Апошні раз я наведаў школу 6 жніўня і быў уражаны зменамі. Хачу яшчэ дапамагчы ў мадэрнізацыі кабінета хіміі і ў набыцці спартыўнага інвентару», – працягвае ён.

«Гонар і слава Старадарожчыны»

За неабыякавасць да жыцця малой радзімы Старадарожчына аддзячыла занясеннем імя Анатоля Антонавіча ў кнігу народнай славы раёна. На пытанне пра тое, што значыць для яго гэта ўзнагарода, ён адказвае: «У першую чаргу мне вельмі прыемна. Лічу, што гэта годна, на стужцы напісана «Гонар і слава Старадарожчыны». Па-другое, гэта дае мне абавязанне яшчэ больш увагі надаваць Старадарожскай зямлі і ў прыватнасці роднай школе № 2. Мяне цягне на малую радзіму. Гэта настальгія, сум па дзяцінстве, родныя месцы даюць сілы і матывуюць на добрыя справы».

Свой 70-гадовы юбілей ён адзначыў у тым ліку і на сваёй малой радзіме сярод сяброў, родных і блізкіх яму людзей. Круглая дата падкрэслівае актывы юбіляра: багаты на досвед, поўны энергіі, малады душою – усё гэта пра яго.

Начальнік упраўлення адукацыі, спорту і турызму райвыканкама Валянціна ЖУКАВЕЦ:

– Старадарожчына – малая радзіма Анатоля Антонавіча, ён у ліку нашых знакамітых выпускнікоў. Навуковец – часты госць у раёне і нашых установах адукацыі. Дапамагае арганізоўваць сустрэчы прафарыентацыйнай скіраванасці, якія павышаюць цікавасць вучняў да навукі. Ён дапамагаў нам з сучасным абсталяваннем кабінета фізікі ў СШ № 2. Гэты кабінет стаў раённым рэсурсавым цэнтрам, дзе займаюцца з адоранымі дзецьмі не толькі другой школы, але і цэлага раёна. Дзеці рыхтуюцца да алімпіяд, навукова-практычных канферэнцый, турніраў па фізіцы. І гэта прыносіць плён: нашы вучні актыўна ўдзельнічаюць у навуковых спаборніцтвах абласнога і рэспубліканскага ўзроўню, атрымліваюць узнагароды, пахвальныя водгукі, дыпломы. Прафесар Мінько таксама перадае літаратуру ў школьную бібліятэку СШ № 2.

Мы ганарымся, што выхадзец са Старадарожчыны дасягнуў такіх высокіх вынікаў у сваёй прафесійнай дзейнасці. Як вядомы навуковец, удзельнік розных праектаў рэспубліканскага і міжнароднага ўзроўню, ён з'яўляецца высокім аўтарытэтам для нашых навучэнцаў, а таксама наглядным прыкладам, што просты чалавек можа дамагчыся высокіх вынікаў дзякуючы стараннасці і працавітасці. Яго навуковыя даследаванні, узнагароды выклікаюць захапленне ў нашых навучэнцаў. Анатоль Антонавіч памятае сваю малую радзіму і дапамагае ёй. Таму ён і стаў адным з ганаровых грамадзян, занесеных у кнігу народнай славы Старадарожчыны.

Алена ЛЯЎШЭНЯ

Даведка

А. А. Мінько ў 1971 г. з адзнакай скончыў фізічны факультэт БДУ. З таго часу па 1979 г. працаваў інжынерам, малодшым, старшым навуковым супрацоўнікам, загадчыкам лабараторыі оптыкі кандэнсаваных асяроддзяў, а з 1979 па 2008 г. – намеснікам дырэктара па навуковай рабоце НДІ ПФП імя А. Н. Сеўчанкі БДУ. У 1977 г. абараніў кандыдацкую, а ў 1990 – доктарскую дысертацыі. У 1993 г. яму прысвоена званне прафесара. З 1993 г. займае пасаду загадчыка кафедры фізічнай оптыкі і прыкладной інфарматыкі фізічнага факультэта БДУ.

Навуковыя кірункі: фізіка і хімія вадкіх крышталяў, аптычнае прыборабудаванне, стварэнне вадкакрышталічных матэрыялаў і сістэм адлюстравання на іх аснове. Вынікі даследаванняў апісаны ў больш як 280 публікацыях, сярод якіх 3 манаграфіі, 6 навучальных дапаможнікаў, 21 патэнт, 20 аўтарскіх пасведчанняў на вынаходствы.

Ён заслужаны дзеяч навукі Беларусі, лаўрэат прэміі Савета Міністраў БССР і прэміі імя А. Н. Сеўчанкі. Узнагароджаны ганаровымі граматамі Міністэрства адукацыі, Савета Міністраў, Міністэрства па надзвычайных сітуацыях, ДКНТ і БДУ, а таксама дыпломам Беларускага фізічнага таварыства. Напярэдадні Дня ведаў А. А. Мінько ўзнагароджаны нагрудным знакам Міністэрства адукацыі «Выдатнік адукацыі».

Жаночае лідарства

АБСЕ правёў для студэнтак БДУ трэнінг

Студэнткі і магістранткі БДУ на пяць дзён адправіліся ў САК «Брыганціна», каб развіць свае лідарскія навыкі. З 2 па 5 верасня дзяўчаты прайшлі трэнінг, які падрыхтавалі супрацоўнікі Бюро па дэмакратычных інстытутах і правах чалавека АБСЕ. Уласны лідарскі стыль, гендарная роўнасць, актывізм і англамоўная камунікацыя – вось чым былі напоўнены гэтыя дні.

Каміла Чарвінска расказала пра стылі лідарства

«У Беларусі адзін з самых высокіх паказчыкаў удзелу жанчын у палітыцы ў Еўропе, каля 30 %. У некаторых краінах, напрыклад, Германіі, ёсць квоты ў парламенце толькі для жанчын, мы прапануем такое і іншым краінам», – гаворыць **Цііна Кукаама-Бах**, начальнік аддзела дэмакратычнага ўпраўлення і гендарнай роўнасці ў БДІПЧ. Гэтая арганізацыя выступае за роўныя магчымасці мужчын і жанчын, асабліва ў палітыцы. «Для паляпшэння сітуацыі мы праводзім спецыяльна распрацаваныя трэнінгі па лідарстве для маладых жанчын. У будучыні яны могуць заняць пасады ў парламенце», – тлумачыць **Ніно Чантурыя**, эксперт па пытаннях гендарнай роўнасці і камунікацыі.

З раніцы да вечара дзяўчаты шукалі свой лідарскі стыль, вызначалі каштоўнасці і таленты. На англійскай іх праводзіла **Каміла Чарвінска**, эксперт у галіне лідарства.

Ад універсітэта спікерам выступіла начальнік аддзела моладзевых праграм і праектаў УВРМ **Наталля Ярашэвіч.** Яна патлумачыла, чым абгрунтавана меркаванне «зарплата ў жанчын у Беларусі меншая, чым у мужчын»: уся справа ў сферах занятасці. Колькасць жанчын-работніц у сферах аховы здароўя і сацыяльных паслуг (85,6 %) і адукацыі (81,2 %) шмат у чым перавышае ў працэнтных суадносінах колькасць мужчын. Як вядома, заработная плата ў дадзеных сферах невысокая. «У БДУ створаны ўсе ўмовы для самарэалізацыі дзяўчат. У конкурсе «Найлепшы моладзевы праект–2018» з сямі пераможцаў было шэсць дзяўчат, а ў 39 пададзеных праектах 27 кіраўнікоў-дзяўчат. Дарэчы, самая маладая дэпутат Мінгарсавета – наша магістрантка Вольга Цесакова», – распавяла Наталля.

Не абышлося і без прыкладу палітычнага лідарства – **Людмілы Макарынай-Кібак** – урача-отарыналарынголага, члена Палаты Прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь і старшыні пастаяннай камісіі па ахове здароўя, фізічнай культуры, сямейнай і моладзевай палітыцы. Пра сваю медычную і палітычную кар'еру, прафесійнае станаўленне, сакрэты планавання і сямейныя каштоўнасці яна распавяла на сустрэчы з дзяўчатамі. «Калі разумееш боль і спагадаеш людзям у медыцыне, а ў палітыцы разумееш тое, што трэба народу – зможаш дапамагчы. Пацыенты і грамадзяне на прыёме вельмі падобныя: адны скардзяцца на хваробы, іншыя скардзяцца, што цячэ дах. Для таго, каб дамагчыся поспеху, трэба шмат працаваць: сумленна, шчыра і цалкам аддаючы сябе справе. Калі хочацца сысці адразу пасля працы, каб дома паляжаць на канапе, то нават не варта пачынаць. Я называю свой стыль лідарства матчыным. Лічу, што павінна пра ўсіх паклапаціцца. Заўсёды ведаю, што ў каго ў сям'і, якія праблемы: калі ты не жывеш праблемамі свайго калектыву, вельмі цяжка ім кіраваць», – падзялілася яна на нефармальнай сустрэчы.

Людміла Эдуардаўна супакоіла дзяўчат і прадстаўнікоў БДІПЧ: ніякіх перашкод пры пабудове кар'еры і ўрача, і палітыка ёй не стваралі: «Часам бар'еры будуюць сабе самі жанчыны, калі няправільна ўспрымаюць атачэнне. У перыяд маёй працы ў РНПЦ отарыналарынгалогіі я кіравала 1300 супрацоўнікамі. У нашай краіне ў жанчын няма перашкод у пабудове кар'еры – яны задзейнічаны і ў палітыцы – у нас 30 % жанчын у парламенце. Важная ў першую чаргу кампетэнтнасць спецыяліста, а не яго пол. Наадварот, дзе б я ні з'яўлялася: у клініцы, акадэміі, на тэлебачанні – я чую шмат кампліментаў, і гэта ўздымае мне настрой», – прызналася яна.

Удзельніцы трэнінгу атрымалі рэкамендацыі правесці аналагічныя мерапрыемствы па тэме жаночага лідарства на сваіх факультэтах і ў студэнцкіх арганізацыях БДУ.

Надзея МАРХЕЛЬ

Летняя школа ў Даляні зноў сустрэла беларускіх студэнтаў

Дваццаць студэнтаў БДУ прынялі ўдзел у другой міжнароднай летняй школе Сумеснага інстытута ДПУ–БДУ ў Кітаі з 2 па 19 ліпеня. Слухачамі сталі найлепшыя студэнты механіка-матэматычнага і фізічнага факультэтаў, якія вучацца па спецыяльнасцях «механіка і матэматычнае мадэляванне», «камп'ютарная фізіка», «ядзерная фізіка і тэхналогіі» і «фізіка (вытворчая дзейнасць)».

Праект летняй школы не першы ў практыцы ўніверсітэта. Падобная школа ўжо праводзілася мінулым летам на базе Далянскага ўніверсітэта, тады 18 беларускіх студэнтаў упершыню адправіліся спасцігаць прыродазнаўчыя навукі ў Далянь. А праз паўгода Беларусь наведалі 20 кітайскіх студэнтаў – яны прынялі ўдзел у першай міжнароднай зімовай школе на базе БДУ.

Разам са студэнтамі ў Далянь адправілася старшы выкладчык кафедры англійскай мовы прыродазнаўчых факультэтаў БДУ **Галіна Пусянкова**. Менавіта яна курыравала нашых студэнтаў у Кітаі, пра праект гаворыць так:

– Праграма другой міжнароднай летняй школы – гэта вывучэнне сучасных праблем прыкладной фізікі і механікі, англійскай мовы, наведванне даследчых лабараторый ДПУ. Акрамя вучобы, студэнтам таксама была прапанавана разнастайная культурная і экскурсійная праграма: знаёмства з гісторыяй Кітая, сумеснае гатаванне нацыянальных страў, вывучэнне каліграфіі... Праблем з камунікацыяй у нас не паўстала – за кожным студэнтам быў замацаваны моўны партнёр-сябар, які дапамагаў на працягу ўсяго знаходжання ў Даляні. Заўважыла, што студэнты двух універсітэтаў пасябравалі і гатовыя зноў сустрэцца, але ўжо на зімовай школе ў БДУ.

Сёлета я выступіла як арганізатар і навуковы кіраўнік шэрагу міжнародных навуковых конкурсаў, былі праведзены майстар-класы для ўдзельнікаў. Падчас іх выкарыстоўваліся самыя інавацыйныя педагагічныя тэхналогіі. Лічу, што студэнты БДУ годна прадставілі наш універсітэт і краіну – выйгралі 5 залатых, 5 сярэбраных і 3 бронзавыя медалі. Я шчыра віншую прызёраў!

Па меркаванні Галіны Аляксеёўны, падобныя падзеі ўмацоўваюць супрацоўніцтва паміж БДУ і ДПУ ў адукацыйнай сферы. «Яны выяўляюць індывідуальныя здольнасці студэнтаў, з якімі тыя атрымліваюць максімальны адукацыйны вынік. Таксама павышаецца прэстыж універсітэта, для студэнтаў Далянскага ўніверсітэта становіцца прывабнай далейшая вучоба ў БДУ. Рэгулярнае правядзенне зімовых і летніх школ Сумеснага інстытута будзе спрыяць цеснаму збліжэнню нашых устаноў адукацыі і наладжванню сяброўскіх кантактаў», – працягвае выкладчык.

Студэнты БДУ і ДПУ Максім Маісееў і Сіе Джаа

Прызёры БДУ

International Public Speaking Competition: залаты медаль (Максім Маісееў), сярэбраны медаль (Марыя Шайдак, Клаўдзія Камяк, Надзея Фралова), бронзавы медаль (Арына Храпунова).

Science Slam: залаты медаль (Аляксей Гусянцоў, Арцём Адушкевіч), сярэбраны медаль (Анастасія Дасюкевіч), бронзавы медаль (Валерый Лаўраненка).

International Joint Research Project: залаты медаль (Дар'я Кісурына, Таццяна Пуляк), сярэбраны медаль (Аляксандр Шчакачыхін), бронзавы медаль (Данііл Чаркасаў).

Навуковы кіраўнік конкурсаў – старшы выкладчык Галіна Пусянкова.

Максім МАІСЕЕЎ,
студэнт 2 курса фізічнага факультэта:

– Самыя яркія моманты для мяне – гэта міжнародныя конкурсы і інавацыйны праект, прысвечаны параўнанню БДУ і ДПУ. У камандзе з кітайскімі студэнтамі нам трэба было прааналізаваць сістэму адукацыі ў дзвюх УВА. Мы аператыўна высветлілі, якія перавагі і недахопы ёсць у кожным універсітэце, і прэзентавалі свой праект на публіцы. У выніку выйшла ярка і інфарматыўна.

Падчас праходжання летняй школы я таксама ўдзельнічаў у міжнародным конкурсе International Public Speaking Competition. Галоўнай задачай было цікава распавесці пра лаўрэата Нобелеўскай прэміі. Я ўжо ўдзельнічаў у падобным конкурсе ў БДУ, і гэты досвед вельмі спатрэбіўся. У камандзе са сваім моўным партнёрам Сіе Джаа мы падрыхтавалі выступленне пра савецкага фізіка Льва Ландау. Мы змаглі данесці да публікі важнасць яго дасягненняў, а таксама адказаць на анлайн-пытанні, якія задалі слухачы. Па выніках інтэрнэт-галасавання нам прысудзілі залаты медаль, і я вельмі ганаруся гэтым дасягненнем!

Анастасія НІКАЛАЙЧЫК,
студэнтка 2 курса фізічнага факультэта:

– Хачу выказаць велізарную падзяку БДУ за магчымасць паўдзельнічаць у летняй школе! Для мяне гэта стала ўзрушальным вопытам: я завяла новыя знаёмствы, атрымала мноства эмоцый і здабыла новыя веды. Зараз, пабываўшы ў летняй школе, я з нецярпеннем чакаю зімовую, каб убачыць сваіх новых сяброў і пазнаёміць іх з нашым універсітэтам і краінай.

Алена ВОЛКАВА

УНІВЕРСІТЭТ
17 верасня 2019 года, № 11 (2217)

Студэнты БДУ ў першы дзень ва ўніверсітэце весяліліся з NIZKIZ, частаваліся ласункамі і… чысцілі бульбу

Віват студэнт!
Віват БДУ!
Менавіта гэтыя словы далі старт штогадовай канцэртнай праграме для першакурснікаў, якая прайшла 1 верасня ў Палацы спорту.



Фота Васіля КУЗЬМІЧКІНА

Знаёмства нашых новых студэнтаў з будучай альма-матар пачалося з яркага захапляючага лазернага шоу, парада дэканаў пад гербамі факультэтаў і вітальнай прамовы рэктара Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта **Андрэя Караля**. Ён пажадаў кожнаму з першакурснікаў пражыць час навучання ў найлепшай ВНУ краіны як адзіны ўздых і знайсці тут саміх сябе, навучыцца выходзіць за ўласныя межы і глядзець на сябе вачыма іншых людзей, навучыцца чуць і слухаць суразмоўцу, каб тыя веды, якія будуць выпрацоўвацца разам з выкладчыкам, зрабілі кожнага шчаслівым на ўсё наступнае жыццё.

Пасля вітальнага слова кіраўніка ўніверсітэта на сцэну запрасілі студэнтку першага курса **Валянціну Хмялеўскую**, якая набрала 398 балаў і паступіла на факультэт міжнародных адносін. Ёй выпаў гонар прамовіць урачыстую клятву першакурснікаў і атрымаць сімвалічны студэнцкі квіток пад акампанемент універсітэцкага гімна, які выканала група «Галант».

У другім блоку канцэртнай праграмы вядучыя прадстаўлялі найлепшыя творчыя калектывы нашай ВНУ, а ў трэцяй частцы свята новых студэнтаў віншавалі сваімі выступленнямі зоркі БДУ і беларуская рок-група NIZKIZ. Саліст групы **Аляксандр Ільін** распавёў, што яны ўжо другі год запар выступаюць на «Віват студэнт!» і што першакурснікі з цеплынёй прымаюць іх творчасць. «Усе вельмі бадзёрыя, прыгожыя і вясёлыя. Хочацца ім пажадаць заставацца самімі сабой, старацца. Ніякіх звышнатуральных рэчаў, проста рабіць тое, што ім падабаецца, сумленна, шчыра, і ўсё атрымаецца!» – такія цёплыя словы перадаў Аляксандр нашым дарагім першакурснікам праз газету «Універсітэт».

Але канцэртная праграма – гэта далёка не ўсё, з чаго складалася мерапрыемства «Віват студэнт!». У холе Палаца спорту размясціліся грамадскія арганізацыі БДУ са сваімі пляцоўкамі. Кожная з іх падрыхтавала для студэнтаў непаўторную забаўляльную праграму. Так, творчы саюз танчыў разам з першакурснікамі ў гульні Just dance і спяваў караоке, а прафкам развіваў у пачаткоўцах трапнасць, хуткасць і кемлівасць у спартыўных актыўнасцях, а потым раздаваў гарантаваныя салодкія прызы. Як выказаўся **Максім Цюцянькоў**, адзін з арганізатараў пляцоўкі прафкама: «Мы падрыхтавалі менавіта салодкія прызы, каб падсаладзіць нашых студэнтаў, каб яны сталі яшчэ дабрэйшымі, яшчэ весялейшымі. Салодкае заўсёды робіць людзей радаснымі. І наша арганізацыя вырашыла зрабіць іх больш шчаслівымі».

Студэнцкі саюз і БРСМ завабліваліпершакурснікаў напоямі, бо на вуліцы стаяла спякота, а ў палацы віравала жыццё. А савет старастаў БДУ наогул зладзіў «Восеньскі прызыў», дзе дзеці змаглі навучыцца ўсяму, што неабходна ўмець сапраўдным старастам. «Староста павінен быць акуратным і хуткім, – запэўніў старшыня савета старастаў эканамічнага факультэта **Арцём Латышаў**, – менавіта таму мы навучаем іх афарбоўцы травы. На наступнай кропцы дзеці вучацца дакладнасці: там яны чысцяць бульбу – таксама вельмі важны занятак. Дзяўчатам, можа, гэта не так актуальна, аднак хлопцам надзвычай карысна. Але мы імкнёмся, каб кожны чалавек прайшоў гэту школу і стаў нармальным чалавекам, і старастам, і годным студэнтам найлепшай ВНУ нашай краіны».

Кожная моладзевая арганізацыя вельмі чакае ў новым навучальным годзе актыўных, пазітыўных і годных студэнтаў, каб заяўляць пра сябе, развівацца і разам скараць усе вяршыні. Бо БДУ – гэта не толькі адукацыя, а таксама адна вялікая сям'я.

Анастасія БАЛТОЎСКАЯ

УНІВЕРСІТЭТ
Выдаецца з 1929 года

Заснавальнік газеты – Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт
Выданне зарэгістравана Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Рэгістрацыйнае пасведчанне № 1082 ад 21 студзеня 2010 года

17 верасня 2019 года
Падпісана да друку 16.09.2019 г.
Зак. 571. Тыраж 1000 экз.
Надрукавана ў РУП «Выдавецкі цэнтр БДУ».
ЛП № 02330/117 ад 14.04.2014.
Вул. Чырвонаармейская, 6, 220030, г. Мінск.

Рэдактар Сяргей Сяргеевіч ШАФАЛОВІЧ
Карэктар Ганна Яўгенаўна РАК
Адрас рэдакцыі: 220030, Мінск, прасп. Незалежнасці, 4
Прыёмная: вул. Кальварыйская, 9, каб. 719, тэл. 259-70-77,
e-mail: gazeta@bsu.by; www.gazeta.bsu.by